# Да пытання страхавой і крэдытна-фінансавай дзейнасці

Ігар МЕЛЬНІКАЎ



Гісторык
магістр Варшаўскага ўніверсітэта

У другой палове XIX — пачатку XX ст. у беларускіх губернях Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі склаліся спрыяльныя ўмовы для сацыяльна-палітычнай і эканамічнай дзейнасці дваранства Беларусі. Паражэнне паўстання 1863—1864 гг. і эканамічная мадэрнізацыя эканомікі Расійскай Імперыі, выкліканыя буржуазнымі рэформамі 60-х гг. XIX ст. сфарміравалі сярод беларускай шляхты ўпэўненасць у неабходнасці мірнага, арганічнага супрацоўніцтва з дзяржаўнай адміністрацыяй Расійскай Імперыі.

Адным з найбольш паспяховых праяў дзейнасці найвышэйшых слаёў грамадства тагачаснай Беларусі было стварэнне і праца сельскагаспадарчых таварыстваў. Пачыналіся яны як “адміністрацыйны праект” адпаведных царскіх чыноўнікаў, але з цягам часу сталі галоўнымі грамадска-эканамічнымі ўстановамі ў беларуска-літоўскіх губернях. Больш за тое, у рамках гэтых арганізацый ствараліся паспяховыя крэдытна-фінансавыя і страхавыя арганізацыі. Аднак трэба канстатаваць, што гісторыя дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў увогуле і створаных імі дапаможных арганізацый слаба вывучана ў айчыннай гістарыяграфіі. Іншая сітуацыя склалася ў польскай гістарыяграфіі, дзе, напрыклад, Мінскаму сельскагаспадарчаму таварыству прысвечана даволі значная колькасць гістарычных даследаванняў [1]. На жаль, не дастаткова глыбока вывучана і гісторыя дзейнасці фінансавых і страхавых арганізацый, створаных пры сельскагаспадарчых таварыствах. Гэты артыкул прысвечаны аналізу гісторыі дзейнасці менавіта падобных дапаможных арганізацый, якія працавалі ў рамках Мінскага сельскагаспадарчага таварыства (далей — МСТ).

Падкрэслім, што ідэя стварэння МСТ належала “піянеру рускай культуры на Міншчыне” міністру ўнутраных спраў Льву Макаву [2, с. 39]. У 1876 г. быў зацверджаны статут гэтай арганізацыі. Аднак надзеі на тое, што галоўную ролю ў гэтых арганізацыях будуць адыгрываць рускія дваране, не апраўдаліся. Менавіта мясцовая беларуска-польская шляхта стала галоўным рухавіком эканамічнага жыцця гэтага рэгіёна. Адміністрацыя таварыства імкнулася мадэрнізаваць шляхецкую сельскую гаспадарку на тэрыторыі Мінскай губерні. Ствараліся склады сельскагаспадарчых машын, угнаенняў. На тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі знаходзілася значная колькасць рускіх войскаў. Гэты фактар добра выкарыстала кіраўніцтва МСТ. Паспяховыя перамовы з вайсковым кіраўніцтвам прывялі да заключэння дамовы на пастаўку збожжа, мукі і кашы для вайсковай інтэндантуры. Напрыклад, у 1889 г. МСТ атрымаў заказ на пастаўку 300 тыс. тон збожжа для войска [3, с. 714]. Мінскія памешчыкі былі манапалістамі і ў пастаўцы мяса і мясной прадукцыі ў войска [3, с. 715].

Аднак тагачасныя мінскія прадпрымальнікі з асяроддзя землеўласнікаў разумелі, што дзеля таго каб забяспечыць паспяховую эканамічную дзейнасць, трэба стварыць эфектыўныя страхавыя і крэдытныя арганізацыі. Так, 8 лютага 1890 г. адміністрацыя МСТ заключыла дамову з Пецярбургскім паўночным страхавым таварыствам, па якім мінчане атрымалі права, гаворачы сучаснай мовай, стварыць акцыянерную даччыную кампанію і быць прадстаўнікамі інтарэсаў пецярбуржцаў на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю [4, с. 234]. Па дамове, якую падпісалі з боку МСТ граф Караль Чапскі і Антон Багдашэўскі, а з боку Пецярбургскага паўночнага страхавога таварыства П. Марозаў, мінчане атрымалі права ў якасці дывідэндаў атрымліваць 10% ад усёй сумы заключаных страхавых дагавораў [5, с. 86]. Акрамя гэтага, прадстаўнікі Паўночна-Заходняга краю атрымалі магчымасць плаціць на 25% менш за страхаванне гаспадарчых пабудоў і на 15% менш пры страхаванні фабрычнай вытворчасці, кошт якой перавышаў

30 тыс. рублёў [6, с. 199]. Была створана сетка страхавых агентаў (па два на кожны павет шасці заходніх губерняў). Пасля атрымання ў 1892 г. згоды ад улад былі створаны пасады ганаровых страхавых куратараў, якія павінны былі кантраляваць страхавую дзейнасць агентаў [6, с. 201].

Дзякуючы актыўнай і паспяховай дзейнасці адміністрацыі МСТ 17 лютага 1900 г. было створана Мінскае таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання.

землеўласнікамі на Ковеншчыне, якія за сваё ўступленне ў страхавое таварыства хацелі атрымаць 30-працэнтную скідку на страхавыя паслугі [9]. Дарэчы, гэтае патрабаванне Эдварду Вайніловічу ў Мінску перадалі не хто іншыя, як будучы прэм'ер-міністр Расіі Пётр Сталыпін і беларускі шляхціч Аляксандр Мейштовіч. Дамовіцца не атрымалася, і ковенскім землеўласнікам ў 1902 г. давялося ствараць асабістую страхавую арганізацыю.

*На працягу ўсяго толькі аднаго года Мінскае таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання сабрала капітал у 60 тыс. рублёў.*

Яно ў асноўным страхавала ад пагрозы пажару. Розніца паміж акцыянерным таварыствам і таварыствам узаемнага страхавання была ў тым, што калі першае мела пастаянныя страхавыя стаўкі, то стаўкі другога маглі вар'іравацца ў залежнасці ад страхавога выпадку. Дарэчы, тыя землеўласнікі, якія страхаваліся ў Мінскім таварыстве ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання, мелі магчымасць атрымліваць дывідэнды ў перыяды, калі колькасць пажараў не была вялікай [7]. Акрамя гэтага, кожны дваранін, які застрахаваў у таварыстве ўзаемнага страхавання сваю маёмасць на суму больш чым 3 тыс. рублёў, аўтаматычна атрымліваў права на ўдзел у агульных сходах таварыства [8] .

На працягу ўсяго толькі аднаго года Мінскае таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання сабрала капітал у 60 тыс. рублёў [4, с. 236]. Старшынёй праўлення гэтай арганізацыі стаў землеўласнік з навагрудскага павета Вітольд Лопат, а старшынёй Назіральнага савета — знакаміты Эдвард Вайніловіч.

Безумоўна, найбольш значнай праблемай для гэтай установы стала абмежаванне тэрыторыі яе дзейнасці. Так, Мінскаму таварыству ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання было забаронена распаўсюджваць сваю дзейнасць на багатыя Валынскую, Падольскую і Кіеўскую губерні. Праблемы былі таксама і ў адносінах з

Трэба падкрэсліць, што на пачатку XX ст. Мінскае таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання развівалася вельмі хутка. У 1903 г. членамі таварыства былі 1965 землеўласнікаў [10, с. 8]. Агульная сума страхавых аперацый склала больш за 23,5 млн. рублёў [6, с. 214]. Найбольшая колькасць страхавых здзелак адзначалася ў Мінскай і Гродзенскай губернях.

Дарэчы, паспяховая дзейнасць канкурэнтаў прымусіла ў 1903 г. Мінскае акцыянернае страхавое таварыства знізіць на 25% страхавыя тарыфы. У сваю чаргу Мінскае таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання ў перыяд з 1904 г. па 1909 г. без вялікіх цяжкасцей выплаціла дывідэнды сваім кліентам. Аб узроўні развіцця арганізацыі сведчыць параўнальная лічба полісаў і страхавых сум. Калі ў 1901 г. было выдадзена 3068 полісаў на агульную суму 13 995 123 рублі, то ў 1911 г. — 11 224 полісы на суму 53 380 775 рублёў [6, с. 218].

Іншым праектам МСТ быў, на жаль, не да канца рэалізаваны праект стварэння Таварыства ўзаемнага пазямельнага крэдыту. У 1890-х гг. крэдытная кааперацыя ў Расійскай Імперыі знаходзілася не ў лепшым стане. У 1885 г. урадам на чале з Сяргеем Вітэ было прынята Палажэнне аб устанаўленні дробнага крэдыту. Яно ўводзіла новыя фінансавыя ўстановы — крэдытныя таварыствы.

Мінскія землеўласнікі даўно чакалі зменаў у крэдытна-фінансавай сферы. Звязана гэта было з іх незадаволенасцю працай земскіх банкаў. Яны актыўна выступалі супраць дыскрымінацыі дваранства Паўночна-Заходняга краю з боку царскай адміністрацыі. Напрыклад, на лютаўскім з'ездзе МСТ у 1893 г. Яўген Кавалеўскі падкрэсліваў, што ў Віленскім земскім банку ўмовы атрымання крэдыту былі зусім нявыгаднымі для дваран [12].

На гэтым з'ездзе, дарэчы, была абрана спецыяльная камісія на чале з графам В. Тацішчавым, якая павінна была правесці перамовы з кіраўніцтвам Віленскага земскага банка. Члены камісіі падкрэслівалі, што пры існай крэдытнай сістэме немагчыма гаварыць аб эканамічным развіцці беларуска-літоўскіх губерняў. Камісія патрабавала ад банка знізіць сумы аплат за выдзяленне крэдыту, а таксама штрафаў за пратэрміноўку выплат працэнтаў па крэдытах [13, с. 14]. Аднак Віленскі земскі банк адхіліў патрабаванні.

Мінскія дваране пачынаюць кампанію ў пецярбургскай прэсе. Галоўным лейтматывам стала ідэя аб неабходнасці стварэння крэдытных таварыстваў. Граф В. Тацішчаў і Э. Вайніловіч трапляюць на прыём да міністра С. Вітэ, і той абяцае ім падтрымку. На гэту "актыўнасць" з боку шляхты рэагуюць і апаненты. Прадстаўнікі Віленскага земскага банка на старонках газет спрабуюць абвергнуць тэзісы беларускіх дваран пра тое, што ўмовы крэдытавання ў банку нявыгадныя для мясцовай шляхты. Вынікі гэтай "бойкі" былі на карысць шляхты: міністэрства фінансаў Расійскай Імперыі дазволіла банкам выдзяляць крэдыты дваранам на больш спрыяльных умовах.

На пачатку 1899 г. вялікая дэлегацыя прадстаўнікоў Мінскага і Росенскага сельскагаспадарчых таварыстваў, а таксама прадстаўнікоў сельскагаспадарчых сіндыкатаў з Гродна і Кобрына выязджаюць да міністра фінансаў у Пецярбург. Вынікам гэтага візіту была дамова аб зніжэнні земскімі банкамі сумы выплат за пратэрміноўку выплат па крэдытах [14, с. 73].

На гэтым, аднак, не заканчваюцца спробы стварэння мінскімі

землеўласнікамі таварыства ўзаемнага крэдытавання. Адміністрацыя МСТ спрабуе рэалізаваць праект па стварэнні Паўночна-Заходняга сельскагаспадарчага таварыства ўзаемнага кароткатэрміновага крэдыту. Амбіцыйная ідэя не была рэалізавана таму, што не выклікала падтрымкі з боку прадстаўнікоў Віленскага і Ковенскага сельскагаспадарчых таварystваў. Звязана гэта было з тым, што мінчане прапанавалі стварэнне таварыства, якое б засноўвалася на выкупе векселя, прадстаўленага землеўласнікам, а не на доўгатэрміновым крэдыце, заснаваным на закладзе зямельнай маёмасці. Да таго ж, падобныя крэдытныя ўстановы ўжо дзейнічалі ў Шаўляі і Панявежы [15, с. 12]. Акрамя гэтага, землеўласнікі з Ковенскага сельскагаспадарчага таварыства памяталі “справу Мінскага таварыства ўзаемнага страхавання” і спрабавалі за яе “адпомсціць” МСТ.

Член Віленскага сельскагаспадарчага таварыства Ваўжынец Путкамер у адной з прадмоў падкрэсліваў, што землеўласнікі з іншых губерняў, не з’яўляючыся членамі МСТ, але ўваходзячы ў Мінскае таварыства ўзаемнага страхавання, знаходзіліся ў значна горшым становішчы, чым іх калегі з Мінска [16, с. 5, 6].

У 1903 г. МСТ прапаноўвае новы праект — Самастойнае таварыства доўгатэрміновага крэдыту. Дзейнасць таварыства, па планах землеўласнікаў, павінна была ахопліваць усе шэсць губерняў Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі. Э. Вайніловіч ва ўспамінах пісаў, што працы па стварэнні новай арганізацыі ішлі паспяхова, і вось калі засталося толькі атрымаць подпіс Міністра фінансаў С. Вітэ, справа завяршылася фіяскa [2, с. 122]. Расійская Імперыя рыхтавалася да вайны з Японіяй і мінскім землеўласнікам было заяўлена, што справа самастойнага таварыства доўгатэрміновага крэдыту павінна быць адкладзена да лепшых часоў.

Палітычныя змены наступных гадоў (першая расійская рэвалюцыя, выбары ў Дзяржаўную Думу) паўплывалі на дзейнасць МСН. Мінскія землеўласнікі сканцэнтравалі сваю ўвагу на пытаннях палітычнага кшталту, а эканамічныя аспекты паступова адыходзілі на другі план.

Такім чынам, дзейнасць мінскіх дваран у напрамку стварэння крэдытна-фінансавых і страхавых арганізацый у значнай ступені спрыяла мадэрнізацыі эканомікі Беларуска-Літоўскага краю ўвогуле і Мінскай губерні ў прыватнасці. Безумоўна, палітычная сітуацыя, якая склалася ў Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі пасля паўстання 1863—1864 гг., адбілася на дзейнасці дваранства, якое спрабавала захаваць свае пазіцыі ў рэгіёне. Але з цягам часу канкурэнцыя паміж расійскай адміністрацыяй і беларускай шляхтай змянілася супрацоўніцтвам і “працай ад пачаткаў” [17]. Ідэі Варшаўскага і Літоўскага пазітывізму, якімі карысталася дваранства Беларусі, пачалі прыносіць канкрэтныя станоўчыя для Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі вынікі.

*Літаратура:*

*1. Мельнікаў, І. Польская гістарыяграфія дзейнасці Мінскага сельскагаспадарчага таварыства / І. Мельнікаў // Знакамітыя мінчане: матэрыялы бел.-пол. навук. канф., Мінск, 9 лістап. 2004 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. Вялікі, З. Вінніцкі (навук. рэд.) [і інш.]. — Мінск; Вроцлаў, 2005. — С. 108—115.*

*2. Woyniłłowicz, E. Wspomnienia 1847—1928/ E. Woyniłłowicz. — Wilno, 1931. Ч. 1. С. 168.*

*3. Jurkowski, R. Praca organiczna, czy tylko trwanie? Przyczynek do dziejów towarzystw rolniczych i organizacji gospodarczo-społecznych ziemiaństwa polskiego na kresach Północno-Wschodnich w latach 1876—1904 / R. Jurkowski // Przegląd Wsch. — 2000. — R. 6, z. 4. — S. 693—737.*

*4. Jurkowski, R. Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich 1864—1904: działalność społeczno-gospodarcza / R. Jurkowski. — Warszawa: Przegląd Wsch., 2001. — 603 s.*

*5. Żabko-Potapowicz, A. Stulecie działalności ziemiaństwa polskiego, 1814—1914 / A. Żabko-Potapowicz. — Warszawa: Rada Nacz. Org. Ziemiańskich, 1929. — 143 s.*

*6. Życka, L. Działalność popowstaniowa Polakow na ziemi Mińskiej: materiały i wspomnienia / L. Życka, M. Łęska. — Warszawa: Koło Przyjaciół Uchodźców z Mińszczyzny, 1939. — 312 s.*

*7. S.H. (Stanisław Hłasko). Nowa instytucja ubezpieczeń // Kraj. — № 18. 05.05.1900.*

*8. Ustawa Mińskiego Tow. Wzajemnych Ubiezpieczeń Rolnych // Kraj. — № 20. 18.05.1900.*

*9. Okolo rolnictwa. Ankieta „Kraju” // Kraj. — 12(25) kwietnia 1902.*

*10. Maliszewski, E. Żywiol polski na Litwie / E. Maliszewski. — Warszawa: skł. gł. Księg. M. Arcta, 1918. — 16 s.*

*11. M.W. (Melchior Wańkowicz) Z Mińska // Kraj. — № 26. — 29.06.1900.*

*12. Z obrad MTR // Kraj. — № 11. — 12(24).03.1893.*

*13. Журнал комиссии, избранной Минским Обществом Сельского Хозяйства по вопросу о долгосрочном земельном кредите. Заседание 15.06.1893. — Минск, 1893. — С. 87.*

*14. Грабовский, Б. Краткий очерк двадцатипятилетней деятельности Минского общества сельского хозяйства/ Б. Грабовский. — Минск, 1901. — С. 87.*

*15. Maliszewski, E. Polacy i polskość na Litwie i Rusi / E. Maliszewski. —Warszawa: Polskie T-wo Krajoznawcze, 1916. — 37 s.*

*16. Журнал общего собрания членов Виленского общества сельского хозяйства 7 и 8 декабря 1902 г. — Вильно, 1903. — С. 54.*

*17. Romanowski, A. Pozytywizm na Litwie: polskie życie kulturalne na ziemiach litewsko-białorusko-inflanckich w latach 1864—1904 / A. Romanowski. — Kraków: Universitas, 2003. — 485 s.*